# АГУЛЬНЫЯ ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ BELARUS BEEHIVE

## ПРЭАМБУЛА

На дадзены момант падача заявак у праграму Belarus Beehive не нясе пагроз для заяўніка. Аднак, улічваючы тое, што сітуацыя ў Беларусі пастаянна пагаршаецца, мы рэкамендуем загадзя мінімізаваць лічбавыя сляды, якія вы пакідаеце ў працэсе падачы і атрымання падтрымкі ад праграмы Belarus Beehive.

*Для забеспячэння бяспекі пры працы з вэб-аплікацыяй і захавання канфідэнцыйнасці інфармацыі важна прытрымлівацца наступных правілаў:*

1. **Выдача і выкарыстанне спецыяльнага электроннага адрасу**
   Пасля запыту доступу праз форму кожнаму заяўніку прадастаўляецца індывідуальная электронная пошта на абароненым сэрвісе Gmail. Выкарыстоўвайце выключна гэты акаўнт для працы з вэб-аплікацыяй. ***Ніколі*** *не карыстайцеся гэтай поштай праз мабільны тэлефон або прыкладанне на смартфоне!*

2. **Доступ толькі з камп'ютараў**
   Рэгістрацыя і праца з праектнымі прапановамі павінны ажыццяўляцца *выключна* з камп'ютарных прылад.

3. **Блакіроўка сесіі карыстальніка і запыт пароля**
   Наладзьце блакіроўку вашай прылады пасля мінімальнага часу неактыўнасці (напрыклад, 1–2 хвіліны).

4. **Рэжым інкогніта**
   Адкрывайце вэб-аплікацыю толькі ў рэжыме інкогніта вашага браўзера.

5. **Выкарыстанне VPN**
   Падключэнне праз VPN з’яўляецца абавязковай умовай для ўсіх карыстальнікаў. Рэкамендуем выкарыстоўваць надзейныя платныя сэрвісы, такія як NordVPN, ProtonVPN або аналагічныя.
6. **Поўнадыскавае шыфраванне**
   Уключыце поўнадыскавае шыфраванне на ўсіх прыладах. Рэкамендуем выкарыстоўваць убудаваныя інструменты, такія як BitLocker (для Windows) або FileVault (для Mac). Гэта дапаможа захаваць вашу інфармацыю канфідэнцыйнай у выпадку страты, крадзяжу або канфіскацыі камп'ютара.

7. **Захаванне дадзеных**
   Не захоўвайце паролі або іншыя ўліковыя дадзеныя на агульнадаступных прыладах. Пры неабходнасці карыстайцеся менеджэрамі пароляў, такімі як LastPass або Bitwarden.

8. **Неадкладнае інфармаванне**
   У выпадку затрымання прадстаўніка арганізацыі з правам доступу да сістэмы, неадкладна папярэдзьце каманду Belarus Beehive: bh2.0.communication@belarusbeehive.eu

9. **Абмежаванне доступу**
   Доступ да вэб-аплікацыі павінен быць прадастаўлены толькі тым асобам, якім ён неабходны для выканання іх службовых абавязкаў.

BELARUS BEEHIVE